## Галіна СКРЫГАН:

# «ТАТА ЎСЁ РАСКАЗАЎ МАМЕ, АКРАМЯ ТАГО, ШТО ЁН БЕЛАРУСКІ ПІСЬМЕННІК»

**Ва ўтульнай кватэры Галіны Іванаўны адразу кідаецца ў вочы вялікая колькасць кніг і фотаздымкаў. Гэта тое, што шчыльна звязвае жанчыну з памяццю пра бацьку — выдатнага беларускага пісьменніка, нарысіста, крытыка Яна Скрыгана. Ён — адзін з тых, хто, нягледзячы на шматлікія выпрабаванні лёсу, здолеў застацца не толькі творцам, але і чалавекам. Напярэдадні 110-гадовага юбілею з дня нараджэння Яна Аляксеевіча мы завіталі ў госці да яго дачкі.**



Пра перыпетыі жыцця цяпер нагадваюць хіба што старыя сямейныя фота.

### Саюз пісьменнікаў на «Валадарцы»

Сваю творчасць Ян Скрыган пачаў у 19-гадовым узросце, калі з родных Труханавіч, што ў Капыльскім раёне, пераехаў у Слуцк. Як у простым вясковым хлапчуку абудзілася цяга да літаратуры?

— У бацькоў не было вялікай адукацыі, але ж нейкая пачатковая была. І татаў бацька вельмі любіў чытаць. Таму і мой тата да гэтага цягнуўся, — распавядае Галіна Іванаўна. — Ён недзе знайшоў кнігу Янкі Купалы і чытаў яе бацьку. На што той казаў: «Якія словы! Ну-ка, яшчэ раз прачытай!»

У Слуцку Ян пазнаёміўся з Паўлюком Шукайлам і іншымі пісьменнікамі-пачаткоўцамі. Жыццё было вельмі цікавае і насычанае, напоўненае марамі аб лепшай будучыні, эксперыментамі ў розных літаратурных плынях. Галіна Іванаўна ўспамінае з аповедаў бацькі, што маладыя пісьменнікі збіраліся ў кагосьці дома, расцілалі на падлозе кажухі, клаліся на іх і пачыналі размаўляць, дзяліцца ідэямі, спрачацца...

Неўзабаве Яна накіравалі ў Полацк, і ў Расонах ён пазнаёміўся з Петрусём Броўкам. Галіна Іванаўна паказвае мне цікавы фотаздымак з тых часоў, які цяпер можна ўбачыць у музеі Броўкі. На ім маладыя пісьменнікі ў капелюшах.

— Ім па 19 гадоў, яны з Броўкам купілі тыя капелюшы і сфатаграфаваліся ў іх, бо тады гэта лічылася шыкам, — усміхаецца дачка пісьменніка.

Такое разняволенае жыццё працягвалася да 1936 года. Да гэтага часу Ян Скрыган ажаніўся, і жонка Галіна ўжо чакала дзіця. Аднойчы, калі пісьменнік знаходзіўся ў Доме творчасці пад Пухавічамі, яна збіралася наведаць яго. Напярэдадні ўвечары Скрыган падрыхтаваўся да сустрэчы, набыў у краме ласункаў... А ўначы да яго пагрукаліся: «Збірайцеся!»

— Цвярозым розумам тое, што тады адбывалася, не зразумець. Таталітарная сістэма была адрэгуляваная, «бралі» ўсіх запар. Мала таго, што чорныя «варанкі» прыязджалі па людзей ноччу, каб не было відаць, дык яшчэ ездзілі і машыны з надпісам «Хлеб», у якіх таксама вазілі людзей... Сяргей Грахоўскі (беларускі пісьменнік і перакладчык, прайшоў сталінскія лагеры. — **Аўт.**) пасля казаў, што на «Валадарцы» можна было адкрываць аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР, — распавядае Галіна Скрыган.

Нейкі час пісьменнік правёў у турме на вуліцы Валадарскага ў Мінску. Асудзілі яго па сумнавядомым 58-м артыкуле за «контррэвалюцыйную дзейнасць». Перад транспартаваннем у Сібір, калі на вакзале вязняў запіхвалі ў вагоны, на некалькі секундаў зрок выхапіў родны твар жонкі, якая стаяла з маленькім скруткам у руках — нованароджаным сынам... Невядома, якім чынам жанчыны даведаліся, дзе і калі будуць этапаваць іх мужоў, і прыйшлі, каб паглядзець на іх. Гэта была апошняя сустрэча Яна Скрыгана з Галінай.

### Пальцам у... карту

Атрымаўшы 10 гадоў лагераў без права перапіскі, Ян Скрыган апынуўся ў Кемераўскай вобласці. Калі пачалася вайна, ён шмат разоў пісаў заявы з просьбай, каб яго адправілі на фронт. Добра разумеў, што з «зэкаў» фарміравалі «першую калону», трапіць у якую азначала верную смерць. Але гэта яго не спыняла.

І раптам — выпадак. У лагеры не хапала бухгалтараў. І аднойчы ў вязняў запыталіся, хто ўмее лічыць на лічыльніках. Пісьменнік падумаў пра сябе: «Няўжо я не змагу лічыць на лічыльніках?» І падняў руку. Так ён стаў працаваць бухгалтарам. Іван Аляксеевіч не толькі змог самастойна асвоіць новую спецыяльнасць, але і добра спраўляўся са сваімі абавязкамі.

У 1941 годзе невядома як да Скрыгана дайшлі звесткі, што ў дом на Круглай плошчы ў Мінску, дзе жылі яго жонка і сын, трапіла бомба і ўсе загінулі...

— Ён чалавек вельмі моцны і ніколі не ўпадае ў дэпрэсію, — гаворыць Галіна Іванаўна, якая пра бацьку кажа толькі ў цяперашнім часе. — Заўсёды падумае, заўсёды лічыць, што выйсце ёсць. Вось ён і трымаўся.



Ян Скрыган. Няскораны рамантык з жалезнай воляй.

Калі нарэшце ссылка скончылася, пісьменнік выйшаў на волю, аднак ніякай рэабілітацыі не было. Куды ён мог пайсці з такім кляймом, дзе мог пачаць жыццё з пачатку? Гэтае пытанне ён прама задаў чалавеку, які выпісваў яму дакументы аб вызваленні. Той не разгубіўся, загадаў Скрыгану заплюшчыць вочы і тыркнуць пальцам у карту Савецкага Саюза, якая вісела на сцяне. Так і зрабіў. Калі пісьменнік расплюшчыў вочы, яго палец паказваў на Фергану ва Узбекскай ССР.

**Ян падрыхтаваўся да сустрэчы з жонкай, набыў у краме ласункаў... А ўначы да яго пагрукаліся: «Збірайцеся!»**

І ён пайшоў туды. Без грошай, прадуктаў, прасіў падвезці тых, каму было па дарозе, калоў дровы ў жыхароў вёсак, якія за гэта давалі яму ежу, губляў прытомнасць падчас шляху. Нарэшце дабраўся да Ферганы і ўладкаваўся на эвакуяваны з Масквы гідролізны завод, які месціўся на ўскраіку горада.

— У сваіх успамінах тата часта піша, што ў жыцці яму трапляліся розныя людзі — і добрыя, і кепскія. Але добрых было больш, — кажа Галіна Скрыган.

Былы зняволены адразу з дарогі, у чым быў, пайшоў у кабінет дырэктара завода. І сказаў, што шукае працу бухгалтара. Той адказаў, што сапраўды бухгалтар патрэбен. «Але ж вы бачыце, у якім я выглядзе...» — прамармытаў падарожнік. «Я ўсё бачу, — адказаў дырэктар. — Ідзіце афармляйцеся».

### «Дзядзя Ян, ажаніцеся з маёй мамай»

Стаў працаваць, пасябраваў з інтэлігентнай масквічкай Ганнай, якая была на заводзе інжынерам. Яна палавечы шкадавала Яна і нават дзялілася з ім сваімі харчовымі карткамі. Асабліва прывязаўся да беларуса дзесяцігадовы сын Ганны Алік. Аднойчы ён проста сказаў: «Дзядзя Ян, ажаніцеся з маёй мамай!» На што прастадушны Скрыган адказаў, што для гэтага трэба, каб мама хоць крапельку яго палюбіла. Доўга яшчэ малы чапляўся да маці з просьбай «хоць крапельку палюбіць дзядзю Яна»... У выніку ці то просьбы Аліка падзейнічалі, ці проста не магло быць інакш, але Ганна, у якой муж загінуў, стала жонкай Яна Скрыгана. Там жа, у Фергане, у 1948 годзе ў іх нарадзілася дачка Галя, якую на тамтэйшы манер усе звалі Гуленькай. Ганна з разуменнем паставілася да жадання мужа назваць дзяўчынку імем першай жонкі, а калі б нарадзіўся хлопчык — імем сына Усевалада. Ян усё расказаў Ганне, акрамя таго, што ён — беларускі пісьменнік.

Неяк прыйшоў ліст ад знаёмага з Эстоніі, з якім Ян быў у лагеры. Той паведамляў, што ім патрэбен бухгалтар на сланцахімічны камбінат. Не доўга думаючы, сям'я сабрала рэчы і пераехала з Ферганы ў Эстонію. Прадпрыемства, на якое запрасілі працаваць Скрыгана, фактычна стала банкрутам, галоўны бухгалтар уцёк, рабочыя не атрымлівалі зарплату па некалькі гадоў.

— Аднойчы, калі бацьку толькі-толькі ўдалося ўпарадкаваць бухгалтэрыю, да яго прыйшлі раз'юшаныя рабочыя з патрабаваннем заробку. І ён ім сказаў: «Таварышы, не хвалюйцеся, ідзіце спакойна спаць. Заўтра вы атрымаеце ўсе свае грошы». Ён так гэта сказаў, што ўсе заціхлі, і назаўтра людзі атрымалі грошы.

Сям'і выдзелілі дом, з'явіліся грошы, «зажылі як людзі», успамінае Галіна Іванаўна. Але аднойчы проста на працу да Яна Скрыгана прыйшлі двое ў цывільным.

— У 1949 годзе, калі ўжо больш-менш акрыялі ад вайны, выйшаў загад «зверху»: усіх, хто адседзеў 10 гадоў па 58-м артыкуле, трэба зноў саслаць, каб яны не «муцілі ваду». Баяліся, што людзі пачнуць помсціць.

Галіне ўжо было паўтара года, калі бацьку забралі другі раз. Перад ссылкай яму дазволілі зайсці дамоў пераапрануцца і развітацца з роднымі. «Добры трапіўся чалавек, які мяне канваіраваў!» — успамінаў пазней у дзённіках Скрыган.

Дзяўчынка засталася з маці, братам і цёткай. Ганна, жанчына з загартаваным характарам, паабяцала мужу прыехаць да яго. Але яна не ведала, што гэта адбудзецца так хутка. Адзін чалавек, які працаваў у міліцыі кіроўцам, падслухаў размову, што з жонкай Скрыгана таксама збіраюцца расправіцца, і папярэдзіў яе пра гэта. Ганна з сястрой узялі толькі дзяцей, пад выглядам прагулкі акольнымі шляхамі прыйшлі на вакзал і селі ў цягнік. Так яны дабраліся да сяла Сухабузімскага, што ў Краснаярскім краі, і сустрэліся з Янам.

— Якія там былі людзі! Да нас прыходзілі акадэмікі! Калі тата казаў: «Калі я быў у акадэміі...», гэта значыла ў ссылцы, — успамінае Галіна Іванаўна. З тых часоў са словам «акадэмія» ў яе зусім іншыя асацыяцыі, як і са словам «лагер».

### Узлёт пасля падзенняў

Скрыган працаваў бухгалтарам у калгасе. Спачатку сям'я жыла ў людзей, а праз нейкі час змагла купіць зямлянку. У 1953 годзе памёр Сталін, і, пачынаючы з 1954-га, савецкія рэпрэсаваныя пачалі пакідаць лагеры. Сям'я Скрыган прыехала ў Мінск, у 1955 годзе Галя пайшла ў першы клас. Яна Аляксеевіча рэабілітавалі, аднавілі ў правах. Ён актыўна ўключыўся ў літаратурную дзейнасць: працаваў рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР, літкансультантам Саюза пісьменнікаў, рэдактарам і намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Полымя». Быў выдатным знаўцам і стылістам мовы, і Пятрусь Броўка, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская савецкая энцыклапедыя», запрасіў яго на пасаду загадчыка літаратурна-кантрольнай рэдакцыі. Узнагароджаны медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага савета БССР, Ганаровай граматай Вярхоўнага савета Тувінскай АССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі за ўдзел у стварэнні дванаццацітомнай БелСЭ. Заслужаны работнік культуры Беларусі.

— Калі тату было 60 гадоў і трэба было афармляцца на пенсію, мама смяялася: «Янчык, якая прыгажосць: табе 60 гадоў, а стажу — 120». Таму што, калі адбылася рэабілітацыя і аднаўленне ў правах, за кошт ссылкі адзін год працы прыраўнавалі да трох, — тлумачыць Галіна Іванаўна.

Нават два лагерныя тэрміны і зламаныя жыцці блізкіх не загасілі ў пісьменніку любові да Радзімы. Па словах дачкі, ён усё жыццё заставаўся шчырым, дзесьці наіўным, усё рабіў з поўнай аддачай. І пры гэтым не захаваў ніякай крыўды на несправядлівасць лёсу.

**У 1941 годзе невядома як да Скрыгана дайшлі звесткі, што ў дом на Круглай плошчы ў Мінску, дзе жылі яго жонка і сын, трапіла бомба і ўсе загінулі...**

Галіна скончыла музычнае вучылішча і кансерваторыю. Вырасціўшы траіх дзяцей, прычакаўшы ўнукаў, яна прызнаецца, што нарэшце, з выхадам на пенсію, адчула сябе свабоднай, бо можа рабіць тое, што хоча. І робіць: Галіна Скрыган упарадкавала архівы і выдала некалькі кніг свайго бацькі, прэзентацыя апошняй з іх адбудзецца 18 лістапада.

...Яшчэ пры жыцці Яна Аляксеевіча, у 1963 годзе, сям'я атрымала ліст з Заходняй Германіі, у якім быў фотаздымак прыгожага маладога чалавека з надпісам: «Дарагому бацьку ад сына Усевалада». Аказалася, што першая жонка і дзіця пісьменніка не загінулі, іх вывезлі ў Германію, дзе яны і засталіся. З-за «жалезнай заслоны» бацька сына так і не ўбачыў. Затое Галіна Іванаўна паспела двойчы адведаць брата. Некалькі гадоў таму яго не стала...

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*
**Фота аўтара і з сямейнага архіва Галіны СКРЫГАН.**



Злева направа: Сцяпан Сямашка, Паўлюк Шукайла, Пятрусь Броўка, Янка Відук (Скрыган). Полацк, 1927 г.